# Кіраванне адходамі

У Беларусі каля 70% усіх адходаў не перапрацоўваецца і адпраўляецца на звалкі. Пахаванне на смеццевых палігонах – гэта самы неэкалагічны і марнатраўны спосаб абыходжання з адходамі. Таксічныя рэчывы трапляюць у зямлю і грунтавыя воды, а ў працэсе раскладання адходаў выпрацоўваюцца парніковыя газы. Пры гэтым на звалкі адпраўляюцца адходы, якія могуць стаць другаснай сыравінай і быць выкарыстанымі ў вытворчасці.

*- 80% насельніцтва Беларусі лічыць актуальнай праблему збору і перапрацоўкі адходаў, а палова жыхароў краіны ўжо ў той ці іншай ступені сартуе смецце.*

*- У Беларусі працуюць 7 смеццеперапрацоўчых заводаў, 80 ліній па сартаванні цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА)ТКА і каля 2 тыс. прадпрыемстваў, якія паўторна выкарыстоўваюць адходы.*

*- Паводле стану на 2022 г. у Беларусі дзейнічаюць 160 палігонаў ЦКА і сетка міні-палігонаў, дзе сабралася больш за 100 млн. т адходаў.*

Яшчэ 30 гадоў таму ў Швецыі на звалкі вывозілася больш за 60% адходаў, цяпер – каля 1%. Узорную сістэму абыходжання з адходамі ў Швецыі стварылі комплексам захадаў:

- паэтапная забарона на пахаванне розных відаў адходаў і штрафы за няправільнае сартаванне і ўтылізацыю;
- паасобны збор адходаў насельніцтвам;
- будаўніцтва 32 смеццеспальвальных заводаў Waste-to-Energy для атрымання цяпла і электраэнергіі з адходаў, нездатных для перапрацоўкі;
- вытворчасць біягазу з арганічных адходаў і сцёкавых вод;
- стварэнне сеткі цэнтраў паўторнага выкарыстання і крамаў сэканд-хэнд;
- фармаванне экалагічнай свядомасці праз інфармацыйныя кампаніі, адукацыю дзяцей і іх уплыў на старэйшыя пакаленні.

Кіраванне адходамі і зберажэнне рэсурсаў з'яўляецца асновай зялёнай эканомікі. ЕС, ЗША, Канада рэгулююць пытанне адходаў ужо на стадыі стварэння прадукцыі: экадызайн, утрыманне другаснай сыравіны, рамонтапрыдатнасць і перапрацоўвальнасць становіцца абавязковай для шырокага шэрагу прадукцыі, у тым ліку экспартнай. Цыркулярныя бізнес-мадэлі дапамагаюць прадпрыемствам эканоміць на сыравіне і "карбонавых" зборах, развіваць новыя накірункі.

Праблемай застаюцца **адходы, нездатныя для перапрацоўкі**, якія з-за недахопу тэхналогій працягваюць вывозіць на звалкі. Альтэрнатывай можа стаць спальванне адходаў на сучасных заводах Waste-to-Energy (WTE, адходы ў энергію). 6-ступеністая ачыстка робіць сучасныя заводы WTE самым чыстым спосабам спальвання адходаў, дазваляючы размяшчаць іх у межах горада, як у Вене або Стакгольме. Спальванне можа дапамагчы вырашыць праблему гарадскіх звалак, але ў доўгатэрміновай перспектыве неабходна паляпшаць тэхналогіі аднаўлення і перапрацоўкі.

## Крыніцы фінансавання рэформы

Фінансаванне беларусы могуць атрымліваць у выглядзе крэдытаў, грантаў, міжнародных праграм матэрыяльнай і тэхнічнай дапамогі, інвестыцый бізнесу і фінансавых арганізацый, такіх як Сусветны банк, ЕІБ, ЕБРР. Для прыцягнення інвестыцый неабходныя рынчачныя механізмы кіравання галіной, гарманізацыя законаў з ЕС, зялёнае фінансаванне.

*Завод Waste-to-Energy магутнасцю 200 тыс. тон у год здольны пераўтвараць адходы, нездатныя для перапрацоўкі, у электрычнасць і цяпло для 25 тысяч кватэр, эканомячы 55 млн. $м^3$ прыроднага газу. Кошт такога завода складае каля 150 млн. €, а тэрмін акупнасці пры цяперашніх цэнах на энерганосьбіты – ад 7 гадоў.*

## *Карысць для беларусаў*

Кіраванне адходамі не толькі вырашае праблему звалак, але і становіцца рухавіком эканомікі, дазваляючы эканоміць сыравіну і энерганосьбіты, ствараючы новыя працоўныя месцы і вытворчасць, вяртаючы ў сельскагаспадарчы абарот зямлі і аднаўляючы біяразнастайнасць, паляпшаючы якасць жыцця людзей. Сфера перапрацоўкі адходаў стварае 25-60 працоўных месцаў на 10 тыс. тон адходаў, сартаванне і спальванне – 10 і 5 месцаў адпаведна. Развіццё безадходнай эканомікі ў ЕС у 2012-2018 гг. стварыла каля 4 млн. новых працоўных месцаў.

## Як палепшыць кіраванне адходамі ў Беларусі?

Кіраванне адходамі павінна стаць часткай стратэгіі **развіцця цыркулярнай эканомікі**, заснаванай на кругавым выкарыстанні рэсурсаў і мінімізацыі адходаў за кошт экадызайну, прыцягнення ў вытворчасць другасных рэсурсаў і пабочных прадуктаў вытворчасці.

| Заканадаўчыя нормы | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Паменшыць утварэнне адходаў (Reduce)** | |
| - Забарона асобных катэгорый аднаразовых тавараў<br>- Захады для памяншэння аб'ёмаў пластыку і пакункаў<br>- Патрабаванні да экадызайну<br>- Гарантыя права на рамонт<br>- Павелічэнне тарыфаў на несартаваныя адходы<br>- Паэтапная забарона на пахаванне розных відаў адходаў | - Выкарыстоўваць шматразовыя і біяраскладальныя пакункі<br>- Укараняць электронны дакументазварот<br>- Забяспечыць насельніцтва пітной вадаправоднай вадой<br>- Папулярызаваць груднoе гадаванне<br>- Пашырыць сетку рамонтных майстэрняў<br>- Стварыць сістэму шэрынгу і абмену таварамі<br>- Укараняць бізнес-мадэль «Прадукт як паслуга»<br>- Стымуляваць выпуск прадукцыі з доўгім тэрмінам службы, магчымасцю паляпшэння, абнаўлення, рамонту<br>- Адмовіцца ад запраграмаванага старэння прадуктаў, fast-fashion<br>- Ствараць моду на "эка" |
| **2. Паўторна выкарыстоўваць (Reuse)** | |
| - Сістэма збору небяспечных адходаў<br>- Укараненне цэнтраў рэцыклінгу<br>- Стымуляванне паасобнага збору<br>- Стандартызацыя і мэтавыя паказнікі падрыхтоўкі да паўторнага выкарыстання | - Стварыць сетку цэнтраў паўторнага выкарыстання інструментаў, электронікі, мэблі, рыштунку<br>- Усталяваць кантэйнеры для адзення, абутку, тэкстылю<br>- Пашырыць і папулярызаваць сетку крамаў сэканд-хэнд<br>- Выкарыстоўваць ужываныя тавары для запчастак<br>- Увесці мэтавыя паказнікі па падрыхтоўцы да паўторнага выкарыстання для пакункаў, шкла, электронікі |
| **3. Перапрацоўваць (Recycle)** | |
| - Адзіная сістэма паасобнага збору адходаў<br>- Мараторый на выкарыстанне неэкалагічных тэхналогій<br>- Укараненне канкурэнтнай сістэмы ПАВ – пашыранай адказнасці вытворцаў на збор і перапрацоўку<br>- Укараненне экамадуляцыі плацяжоў (забруджвальнік плаціць)<br>- Дэпазітная сістэма абароту тары<br>- Пераход ад манаполіі ЖКГ да рынкавых адносін<br>- Мэтавыя паказнікі па ўтрыманні другаснай сыравіны | - Увесці паасобны збор арганічных адходаў<br>- Абсталяваць грамадскія месцы і жылыя двары кантэйнерамі для арганікі, пакункаў, паперы і інш.<br>- Інфармаваць аб правілах сартавання пачынаючы з садкоў<br>- Збіраць небяспечныя адходы ў крамах, аптэках, школах, спецыялізаваных цэнтрах рэцыклінгу<br>- Выкарыстоўваць другасную сыравіну ў вытворчасці:<br>• будаўнічае смецце для будаўнічых матэрыялаў,<br>• драўняныя адходы для паліўных брыкетаў,<br>• тлушчаў і алеяў для біяпаліва,<br>• старыя шыны для дарожнага пакрыцця,<br>• перапрацоўка і аднаўленне тэкстылю,<br>• мэбля, посуд, адзенне з рэцыкляванай сыравіны<br>- Стварыць Біржу другасных рэсурсаў, экспартаваць іх у ЕС |
| **4. Абыходжанне з адходамі, няздатнымі для перапрацоўкі** | |
| - Паасобны збор арганічных адходаў, забарона іх пахавання<br>- Забарона на пахаванне адходаў, прыдатных для атрымання энергіі<br>- Ліквідацыя міні-палігонаў<br>- Тэхналагічныя стандарты ЕС | - Выраблаць біягаз з арганікі і сцёкавых вод<br>- Атрымліваць цяпло і электрычнасць з ЦКА на заводах WTE<br>- Аднаўляць пластык хімічным рэцыклінгам<br>- Атрымліваць энергію, вадарод, метанол газіфікацыяй<br>- Абсталяваць палігоны лініямі сартавання<br>- Збіраць звалачны газ на палігонах |

Для поспеху рэформы неабходныя рэформа ЖКГ, пашырэнне паўнамоцтваў муніцыпалітэтаў, увядзенне рыначных механізмаў рэгулявання, спрыяльны інвестыцыйны клімат.

*Аўтары: Аляксандра Мамаева ў супрацы з беларускім экспертам*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай*
*Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*